## КІРКОР АДАМ ГАНОРЫЙ КАРЛАВІЧ – 195

Нарадзіўся ў в. Слівіна Магілёўскай губерні (зараз Манастыршчынскі раён Смаленскай вобл.) у 1818 г. Да 1838 г. вучыўся ў Магілёўскай і Віленскай мужчынскіх гімназіях. Падчас вучобы ў Магілёўскай гімназіі, А. Кіркор захапіўся гісторыяй сваёй губерні, свайго народа, яго мовы, культуры, Ён шмат чытаў па гэтых пытаннях, а калі вандраваў па розных кутках губерні, то гутарыў з жыхарамі, запісваў найбольш цікавыя факты, апісваў знаходкі з раскопак, сам удзельнічаў у раскопках. Усё гэта вызначыла яго будучую прафесію – ён стаў буйным этнографам, археолагам, гісторыкам, даследчыкам і папулярызатарам беларускіх старажытных археалагічных знаходак. Матэрыялы А. Кіркора былі запазычаны для працы «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба» (1861-1865), у якой змяшчаюцца дадзеныя па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі заходніх губерняў Расіі, якія ўвайшлі ў яе склад у канцы XVIII ст., у т.л. матэрыялы па Магілёўскай губерні.

А. Кіркор быў захавальнікам Віленскага музея старажытнасцяў, якому падарыў уласную археалога-этнаграфічную калекцыю, якая была сабрана на беларускіх землях, у т.л. на Магілёўшчыне. У сваіх галоўных працах «Литовское Полесье» і «Белорусское Полесье», у нарысах аб Беларусі ў 3-м томе «Живописной России» (1882, чч. 1-2) А. Кіркор адлюстраваў гістарычную і этнаграфічную самабытнасць беларускага народа, даў этнічную і бытавую характарыстыку тыпаў беларусаў, адзначыў самастойнасць беларускай мовы. Для збораў матэрыялаў ён часта прыязджаў у Магілёўскую губерню, пісаў аб старажытнасці Крычава, Мсціслава, падтрымліваў легенду пра Машэку.

А. Кіркор займаўся выдавецкай дзейнасцю і грамадскай працай. У Вільні ён выдаваў літаратурна-навуковыя зборнікі «Радегаст» (1843) і «Размышления» (тт. 1–3, 1845–1846), рэдагаваў часопіс «Виленский сборник» (тт. 1–6, 1857–1858). У 1868–1871 гг. быў адным з выдаўцоў газеты «Новое время» (С-Пецярбург).

А. Кіркор быў абраны член-карэспандэнтам Імператарскага археалагічнага таварыства (1856), членам Акадэміі навук у Кракаве (1873), Правадзейным членам Імператарскага Рускага геаграфічнага таварыства. Памёр у 1886 г.

***У.Г. Хамякоў***



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова